УДК 930.2(476)

# Міхаіл Герасімавіч Елісееў: вучоны, педагог, грамадзянін

**М.В. Стралец*, В.Р. Радзькова****

**Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»*

***Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Жанр навуковай біяграфіі становіцца ўсё больш папулярным у сучаснай гістарыяграфіі. Тым не менш, уяўляецца, што ў айчыннай гістарычнай навуцы створана недастаткова даследаванняў, прысвечаных жыццю і даследчай дзейнасці беларускіх германістаў. Мэта дадзенага артыкула: прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях вядомага беларускага гісторыка, спецыяліста па германскай гісторыі М.Г. Елісеева, якому ў студзені 2010 г. споўнілася б 70 гадоў, акрэсліць ягоны ўклад у беларускую гістарычную германістыку і развіццё вышэйшай школы Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Артыкул падрыхтаваны на аснове матэрыялаў архіва БДУ, сямейнага архіва вучонага, аналіза яго навуковай спадчыны, успамінаў яго вучняў, калег, аднадумцаў. Метад даследавання – праблемна-храналагічны, які прадугледжвае стаўленне на першае месца не гістарычнай рэтраспекцыі, а гістарычнай праблемы, якая вывучаецца на фоне канкрэтных гістарычных з'яў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Міхаіл Герасімавіч Елісееў адносіцца да пакалення «дзяцей вайны». Яму споўнілася крыху больш за год, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Міхаіл нарадзіўся 17 студзеня 1940 г. у вёсцы Кашалёва (русск. Кошелево) Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Яго бацькі – Герасім Паўлавіч (1900 г. нар.) і Лукер'я Мікалаеўна (1896 г. нар.) працавалі ў мясцовым калгасе: бацька займаўся садаводствам, маці працавала на агульных работах. Міхаіл быў малодшым з пяці сыноў у гэтай сям'і. Герасім Паўлавіч і яго старэйшы сын Іван (1926 г. нар.) – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Бацька быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію адразу ж з пачаткам вайны, змагаўся на розных франтах, загінуў у 1943 г. на фронце. Брат Іван застаўся ў жывых і працаваў пасля вайны брыгадзірам завода жалезабетонных вырабаў у Гомелі. Маці прыйшлося адной падымаць сваіх сыноў, працаваць, не прысядаючы, ад зары да зары. Усе атрымалі прафесію, знайшлі сваё месца ў жыцці. Мікалай, 1928 г. нар., стаў шафёрам-вадзіцелем і працаваў у Буда-Кашалёўскай райгастэхніцы. Сяргей, 1932 г. нар., стаў будаўніком, жыў і працаваў у пасёлку Тэльма Усольскага раёна Іркуцкай вобласці. Павел, 1937 г. нар., настаўнік, доўгі час працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў г. Рудзенску Мінскай вобласці [1].

Міхаіл у 1956 г. закончыў сярэднюю школу № 2 у г. Буда-Кашалёве і паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна, які ў тыя гады лічыўся важнейшым у гэтай навучальнай установе. Студэнцкія гады праляцелі імкліва, былі напоўнены слуханнем лекцый, працай на семінарскіх занятках, у бібліятэках, рознымі грамадскімі мерапрыемствамі – шэфства над школьнікамі, нядзельнікі, праца ў калгасах і г.д. Дэканам гістарычнага

***Адрес для корреспонденции:*** 224011, г. Брест, ул. Луцкая, д. 52, кв. 57, e-mail: mstrelez@mail.ru – Стрелец М.В.

факультэта ў той час быў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны дацэнт Пётр Захаравіч Савачкін, уважлівы і вельмі добразычлівы чалавек. Адметнай старонкай студэнцкага жыцця Міхаіла стала праца ў час летніх канікулаў на ўборцы ўраджаю ў Акмолінскай і Какчатаўскай абласцях у 1958 і 1959 гг. Вярталіся ў студэнцкія аўдыторыі студэнты тады пазней, у канцы верасня–пачатку кастрычніка. Міхаіл, як чалавек актыўны, дысцыплінаваны і адказны, карыстаўся аўтарытэтам у таварышаў і выбіраўся ў студэнцкія органы самакіравання, узначальваў студэнцкую прафарганізацыю гістарычнага факультэта.

У 1961 г. па размеркаванні Дзяржкамісіі выхаванец гістарычнага факультэта М.Г. Елісееў быў накіраваны на працу настаўнікам гісторыі ў Сарагоўскую сярэднюю школу Слуцкага раёна Мінскай вобласці, дзе працаваў на працягу двух гадоў. Ён праявіў сябе таленавітым настаўнікам, які валодаў глыбокімі тэарэтычнымі ведамі, добра засвоіў методыку выкладання свайго прадмета. У 1963 г. у школе прыняты ў члены КПСС. У гэтым жа годзе ён сустрэў сваё каханне – яго жонкай стала студэнтка Мінскага інстытута замежных моў Тамара Віктараўна Жук, якая набывала спецыяльнасць выкладчыка англійскай і нямецкай моваў.

У кастрычніку 1963 г. Міхаіл Герасімавіч залічаны ў аспірантуру на кафедру новага і навейшага часу БДУ, яго навуковым кіраўніком быў прызначаны загадчык кафедры прафесар Л.М. Шнеерсон. Сферай навуковых інтарэсаў Міхаіла стала сучасная гісторыя Германіі – знешняя палітыка ФРГ, узаемаадносіны дзвюх нямецкіх дзяржаў – ФРГ і ГДР. У час навучання ў аспірантуры М.Г. Елісееў быў накіраваны ў Берлінскі універсітэт імя А. Гумбальдта ў якасці стажора-аспіранта. Ён стажыраваўся пад кіраўніцтвам вядомага вучонага-гісторыка і антыфашыста, прарэктара, кіраўніка аддзела сучаснай гісторыі Інстытута германскай гісторыі Берлінскага універсітэта, доктара Вальтэра Бартэля. Праз усё жыццё Міхаіл пранёс самыя лепшыя пачуцці да гэтага легендарнага чалавека, які аказаў яму вялікую дапамогу пры рабоце над тэмай кандыдацкай дысертацыі.

Пасля заканчэння аспірантуры ў 1967 г. М.Г. Елісееў быў прыняты на работу выкладчыкам кафедры гісторыі новага і навейшага часу [1, арк. 101], спачатку быў асістэнтам, затым старшым выкладчыкам, з 1973 г. – в.а. дацэнта, а з 1976 г. – дацэнтам гэтай жа кафедры.

У 1971 г. Міхаіл Герасімавіч Елісееў абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Западногерманская политика международной изоляции ГДР и ее крах» (абаронена 11 мая 1971 г., зацверджана ВАК СССР 29 кастрычніка 1971 г.). Афіцыйнымі апанентамі па дысертацыі выступілі: доктар гістарычных навук, прафесар В.Б. Княжынскі (Княжинский) – г. Масква; кандыдат гістарычных навук, дацэнт Э.М. Паздняк (Поздняк) – г. Мінск; вядучай вышэйшай навучальнай установай з'яўляўся Адэскі дзяржаўны універсітэт імя І.І. Мечнікава.

Напрыканцы 1960-х гг. у беларускай гістарычнай германістыцы з'явіліся артыкулы М.Г. Елісеева, якія адразу сталі прыцягваць увагу навуковага супольніцтва. Адным з першых быў артыкул у «Коммунисте Белоруссии». Затым за ім выйшлі іншыя. У 1975 г. была надрукавана кніга «Бонн и ГДР. Как потерпела провал на международной арене политика ХДС/ХСС, направленная против ГДР (1949–1969 гг.)» па комплекснай тэме ўзаемаадносін паміж дзвюма германскімі дзяржавамі ва ўзаемасувязі з унутраным палітычным развіццём ФРГ. Кніга грунтуецца на арыгінальным нямецкім матэрыяле, які быў набыты аўтарам у час узгаданага вышэй навучання ў аспірантуры Берлінскага універсітэта імя Гумбальдта. М.Г. Елісееў паказаў складанасці ўзаемаадносін паміж дзвюма германскімі дзяржавамі, якія ўвабралі ў сябе комплекс праблем біпалярнага свету, «халоднай вайны», міжнароднага права і палітыкі. У кнізе разгледжаны

ўзаемаадносіны ФРГ–ГДР з моманту іх узнікнення і да ўсеагульнага прызнання ГДР і прыёма абедзвюх дзяржаў у ААН. Асаблівае месца адведзена ў кнізе «усходнім» дагаворам ФРГ як сведчанню палітыкі рэалізма ў Еврoпе дзвюх сістэм.

У 70-я гг. М.Г. Елісееў надрукаваў серыю артыкулаў па навейшай германскай гісторыі, у тым ліку артыкул у ГДР, і брашуру, прысвечаную 30-м угодкам ГДР. Займаючыся менавіта гэтым перыядам германскай гісторыі, М.Г. Елісееў стаў надаваць увагу новаму накірунку ў беларускай гістарычнай германістыцы – даследаванню нямецкіх палітычных партый. У 1975–1979 гг. ім былі надрукаваны артыкулы, прысвечаныя леваму партыйнаму флангу тагачаснай ФРГ – КПГ і ГКП, а таксама праваму флангу ў партыйным спектры заходнегерманскай дзяржавы.

У лістападзе 1976 г. М.Г. Елісееў быў пераведзены на пасаду старшага навуковага супрацоўніка для падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі і знаходзіўся на гэтай пасадзе да лістапада 1978 г. Тэмай доктарскай дысертацыі стала даследаванне ролі СвДП у сістэме парламенцкіх партый ФРГ у кантэксце праблемы ўсходняй і германскай палітыкі. Для выканання дысертацыйнай тэмы М.Г. Елісееў быў камандзіраваны ў ГДР, дзе меў магчымасць вывучыць неабходныя крыніцы па дысертацыі [1, арк. 75]. Па завяршэнні дактарантуры М.Г. Елісееў падрыхтаваў дысертацыю, якая была абмеркавана на кафедры і рэкамендавана да абароны. Але цяжкасці з публікацыяй манаграфіі па дысертацыі і грамадска-палітычная работа, якую ўсклаў на свае плечы Міхаіл Герасімавіч, адцягнулі абарону дысертацыі. Толькі ў 1989 г. кніга пад назвай «Между конфронтацией и разрядкой. СвДП в партийной системе ФРГ: проблемы «восточной» политики» выйдзе з друку.

Кніга М.Г. Елісеева асвяціла важныя часткі гісторыі палітычнага нямецкага лібералізма пасля Другой сусветнай вайны. Праца вучонага, якая была напісана на грунце арыгінальных нямецкіх дакументаў, аналіза друку і даследаванняў, распавядала аб узнікненні Свабоднай дэмакратычнай партыі (СвДП), яе ролі ў партыйным механізме ФРГ, у тым ліку і кааліцыйнай урадавай палітыцы ў землях і федэрацыі, але асабліва аб ролі і месцы той партыі ў вызначэнні знешняй палітыкі заходнегерманскай дзяржавы.

Елісееў даследаваў сацыяльныя і ідэйна-палітычныя плыні ў СвДП, эвалюцыю гэтай партыі ў бок рэалізма, барацьбу груповак, расколы партыі і самае галоўнае – знешнепалітычную ролю па комплексе ўсёй «усходняй» палітыкі ФРГ. Кніга закранае сацыялогію парламентарызма. У ёй дадзены жывыя партрэтныя замалёўкі дзеячаў ФРГ і СвДП, а таксама іншых палітычных партый. У кнізе змяшчаюцца два прыкметныя назіранні аўтара: слабасць тэарэтыка-палітычнай базы СвДП і спробы рэаніміраваць лібералізм, які не апраўдаў сябе ў часы Веймара, а затым пераўтварыць у «сацыяльны лібералізм» сучасны абноўлены лібералізм.

У 1989 годзе выйшла яшчэ адна кніга М.Г. Елісеева, надрукаваная ў сааўтарстве з У.Е. Снапкоўскім, пад назвай «Два германских государства и европейская безопасность. История и современность». Навукоўцы паказалі, што ГДР сыграла адну з галоўных роляў у справе захоўвання ўсеагульнага міру ў Еўропе. Абедзве германскія дзяржавы ў двухблокавай палітыцы павольна эвалюцыянавалі ў бок мірнага суіснавання. Вострыя адносіны паміж ГДР и ФРГ ніколі не прыводзілі да ваенных дзеянняў. Адмоўнага ў палітыцы паміж сабой ГДР і ФРГ было шмат, але сістэмнае пераважала, што выратавала мір у Цэнтральнай Еўропе.

У нашы дні, калі з палітычнай карты зніклі і ГДР, і Савецкі Саюз, радыкальна змянілася геапалітычная сітуацыя ў свеце, многае з гісторыі ФРГ успрымаецца ў другім ракурсе. Але няма сумненняў у тым, што трапныя

характарыстыкі дзейнасці вядомых нямецкіх палітыкаў Г. Коля, Г.-Д. Геншэра, Э. Мендэ, Г. Шмідта, В. Шеэля, Ф.Й. Штрауса, дадзеныя Елісеевым у яго працах, не страцілі сваёй актуальнасці. Правячыя колы ФРГ паслядоўна і настойліва выкарыстоўвалі ўсё магчымае, каб абараніць свае нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы. «Халодная вайна» ў вызначаным сэнсе даказала сваю інструментальна-тэхналагічную грунтоўнасць, бо прынесла поспех ЗША, Захаду, якія дамагліся асноўнай мэты – устаранілі свайго галоўнага геапалітычнага канкурэнта – савецкую дзяржаву.

Усяго М.Г. Елісеевым апублікавана каля 50 навуковых прац – названыя манаграфіі, асабіста, альбо ў сааўтарстве, артыкулы ў калектыўных зборніках, навукова-метадычная літаратура. Многія творчыя распрацоўкі праблем навейшай гісторыі Германіі вылучылі яго ў лік буйнейшых спецыялістаў нашай рэспублікі ў сферы гістарычнай германістыкі. У 90-я гады ім быў апублікаваны шэраг прац па гістарыяграфіі германскай гісторыі ў Беларусі, а таксама выканана справаздача па тэме «Новая и новейшая история Германии в трудах белорусских исследователей» у фондзе фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь па тэме «Белорусская историография всеобщей истории».

Міхаіл Герасімавіч ажыццяўляў кіраўніцтва навуковымі працамі аспірантаў кафедры. Ён аказаў вялікую дапамогу сваім аспірантам – грамадзянам В’етнама пры падрытоўцы імі кандыдацкіх дысертацый. У 1988 г. Нгуен Ван Тхы абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Битва при Дьен Бьен Фу и ее значение для национального освобождения Вьетнама», у 1990 г. Нгуен Ке Тхан – па тэме «Борьба Коммунистической партии Индокитая за демократический и национальный фронт во Вьетнаме (1930–1941 гг.)».

Навукова-даследчую працу М.Г. Елісееў паспяхова спалучаў з педагагічнай. У памяці студэнтаў ён застаўся, перш за ўсё, як цудоўны лектар. Ён выкладаў курсы па гісторыі краін Азіі і Афрыкі, навейшай гісторыі краін Захаду. Чытаў вельмі змястоўныя і тэарэтычна абгрунтаваныя спецкурсы па актуальных праблемах гісторыі і сучаснасці ФРГ для студэнтаў-гісторыкаў усіх форм навучання. Для студэнтаў-замежных грамадзян, якія вучыліся ў БДУ, ён распрацаваў і чытаў курс «Актуальныя праблемы нацыянальна-вызваленчых рухаў і сучаснай эканомікі, палітыкі, культуры краін, якія вызваліліся». Студэнты вельмі высока ацэньвалі ўзровень яго лекцый. Пры вывучэнні думкі студэнтаў аб прафесійных і асобасных якасцях дацэнта М.Г. Елісеева (такія апытанні праводзіліся ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў) быў атрыманы высокі бал – 8,6 [1, арк. 24].

Што ж значыла школа Елісеева для маладога папаўнення навуковага і адукацыйнага корпуса? Доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар БДУ У.Е. Снапкоўскі ўспамінае: «Сваё станаўленне як гісторыка я звязваю з імёнамі прафесараў Л.М. Шнеерсона і Г.М. Трухнова, дацэнтаў М.Г. Елісеева і В.І. Сініцы, якія працавалі на кафедры новай і навейшай гісторыі і дзе я праходзіў спецыялізацыю. Найбольш цесныя і трывалыя адносіны ў мяне ўсталяваліся з М.Г. Елісеевым. У студэнцкія гады гэта былі стандартныя адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам пры маёй вялікай павазе і сімпатыі да яго. Пазней, пасля заканчэння універсітэта, падчас навучання ў аспірантуры і маёй далейшай працы выкладчыкам на кафедры новай і навейшай гісторыі паміж намі складліся прыязныя адносіны двух даследчыкаў і выкладчыкаў (старэйшага і малодшага).

Мой выбар тэмы кандыдацкай дысертацыі быў звязаны з даследаваннямі, якія праводзіў Міхаіл Герасімавіч (адносіны паміж дзвюма германскімі дзяржавамі). Ён чытаў на 4-м курсе спецкурс па гэтай тэматыцы, якую пазней я ўзяў у якасці рэферата пры паступленні ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН

БССР. Потым разам з навуковым кіраўніком, прафесарам Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС В.Ц. Фаміным мы вызначылі тэму маёй кандыдацкай дысертацыі (адносіны паміж ГДР і ФРГ у 1970-я гады). Калі я прыехаў з Масквы, паведаміў пра свой выбар М.Г. Елісееву, чакаючы яго адабрэння. Замест гэтага атрымаў халодны душ. Мой старшы калега адгаворваў ад гэтай цяжкай тэмы, падкрэсліваючы ў прыватнасці парадны і дэкларатыўны характар дасягненняў сацыялістычнай ГДР, слабасць яе эканомікі ў параўнанні з заходнегерманскай, будучыя цяжкасці з публікацыяй артыкулаў пра «нямецка-нямецкія адносіны». Гэта былі тыя праблемы, з якімі ўжо сутыкнуўся ён у даследаванні гэтай тэматыкі, таму Міхаіл Герасімавіч па-сяброўску не жадаў, каб і мне выпалі тыя ж самыя выпрабаванні. Аднак тут вырашальную ролю адыграў навуковы аўтарытэт В.Ц. Фаміна, аднаго з вядомых савецкіх германістаў, дарэчы ўраджэнца Беларусі (з-пад Оршы). Таму М.Г. Елісееў, хоць і не адразу, аднак адобрыў наш выбар і далей дапамагаў мне сваімі добрымі парадамі. Я, у сваю чаргу, забяспечваў яго інфармацыяй пра новую айчынную і замежную літаратуру, якую прачытваў падчас камандзіровак у Маскву.

Ён быў афіцыйным апанентам кандыдацкай дысертацыі, якую я абараніў у 1980 г., даўшы ёй добрую адзнаку і не забыўшыся пра слушныя заўвагі. Па яго рэкамендацыі пасля абароны я быў запрошаны Л.М. Шнеерсонам выкладчыкам кафедры новай і навейшай гісторыі па сумяшчальніцтве, дзе прайшлі мае, калі можна так сказаць, "выкладчыцкія універсітэты". Міхаіл Герасімавіч быў строгім настаўнікам. Пасля маёй першай адкрытай лекцыі (я чытаў эканамічную гісторыю замежных краін) ён зрабіў шмат заўваг як па змесце, так і па форме выкладання матэрыялу, што я лічыў і лічу справай цалкам справядлівай і патрэбнай для кожнага пачынаючага выкладчыка.

Засцярогі майго старшага таварыша наконт цяжкасці публікацыі пра германска-германскія адносіны спраўдзіліся. Працуючы ў Інстытуце гісторыі АН БССР, я падрыхтаваў рукапіс манаграфіі «ГДР–ФРГ: цярністыя шляхі разрадкі (70-я гады)» (на рускай мове). Ён быў рэкамендаваны да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі, але так і не ўбачыў свет. Рэцэнзіі з боку маскоўскіх вучоных былі не на карысць публікацыі. Мае наступныя дапрацоўкі значэння не мелі. Тэма была прызнана палітычна небяспечнай і як бы закрытай для публікацыі, тым больш маладым вучоным з Мінска. У аблегчаным і навукова-папулярным варыянце я ўсё ж такі апублікаваў частку матэрыялаў са свайго рукапісу ў кнізе «Два германских государства и европейская безопасность: История и современность». (Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 152 с.), якую падрыхтаваў разам з М.Г. Елісеевым. Гэта кніга, якая выйшла да 40-годдзя ГДР, аказалася аднак нашым незапланаваным агульным падвядзеннем вынікаў існавання сацыялістычнай нямецкай дзяржавы, якая знікла адразу ж пасля юбілейных мерапрыемстваў».

Гэты неардынарны чалавек істотна паўплываў таксама на фарміраванне гістарычнага светапогляду дактароў гістарычных навук, прафесараў Г.А. Космача [2], Н.І. Палятаевай [2, с. 301], кандыдатаў гістарычных навук, дацэнтаў М.С. Даўгялы [2, с. 96], С.А. Кізімы [2, с. 161], А.С. Ляднёвай [2, с. 220], В.Р. Радзьковай [2, с. 313], С.С. Рудовіча [2, с. 324], кандыдатаў гістарычных навук А.Г. Зельскага [2, с. 136], Л.У. Языковіч [2, с. 452].

М.Г. Елісееў быў чалавекам з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай у калектыве гістарычнага факультэта. Неаднаразова выбіраўся сакратаром партбюро гістарычнага факультэта, уваходзіў у склад парткама і мясцкама БДУ. У 1980 г. быў выбраны сакратаром партыйнага камітэта БДУ і ўзначальваў партыйную арганізацыю да 1983 г. Яму, як кіраўніку вялікага калектыву, былі ўласцівы дэмакратызм,

дыпламатычнасць, прынцыповасць, настойлівасць у адстойванні ўласных поглядаў. Ён ніколі не быў канфармістам, толькі сапраўдным патрыётам. У перыяд кіраўніцтва парткамам з'яўляўся членам Мінскага гаркама, Маскоўскага райкама КПБ, дэпутатам Маскоўскага раённага савета дэпутатаў працоўных. Неаднаразова выступаў з кваліфікаванымі дакладамі па пытаннях ідэалагічнай і выхаваўчай работы на навукова-практычных канферэнцыях, якія праводзіліся гарадскімі і раённымі партыйнымі камітэтамі. Часта выступаў па радыё і тэлебачанні на тэмы міжнароднага жыцця, публікаваўся ў перыядычным друку. Многа лекцый чытаў па лініі таварыства «Веды». Актыўная навуковая і грамадская дзейнасць М.Г. Елісеева атрымала належнае прызнанне. Ён быў узнагароджаны Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ, Мінвуза БССР, неаднаразова – граматамі БДУ. У 1982 г. за актыўную вытворчую і грамадскую дзейнасць М.Г. Елісееў быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР [1, арк. 33].

М.Г. Елісееў з'яўляўся на працягу многіх гадоў членам Савета гістарычнага факультэта, Савета па прысуджэнні вучоных ступеняў кандыдата гістарычных навук, у 1978–1984 гг. – членам Савета універсітэта. Ён добра ведаў нямецкую мову, часта выступаў перакладчыкам на афіцыйных прыёмах ці пры чытанні лекцый замежнымі палітыкамі і вучонымі. Часта бываў у замежных камандзіроўках – як стажор, як удзельнік навуковых канферэнцый, як кіраўнік студэнцкай групы, якая выязджала на практыку ў ГДР – Іенскі універсітэт імя Ф. Шылера. У кастрычніку–лістападзе 1989 г. прачытаў цыкл лекцый «Савецкае грамадства на этапе перабудовы» ў Берлінскім універсітэце імя А. Гумбальдта, Растокскім універсітэце, перад актывам аднаго з раёнаў Берліна (у межах Дзён Беларускай ССР у ГДР) [1, арк. 28].

Міхаіл Герасімавіч быў шчаслівым у сямейным жыцці. Адналюб, ён разам з Тамарай Віктараўнай выхаваў двух сыноў. Старэйшы – Павел, 1964 года нар., закончыў Мінскі медуніверсітэт, атрымаў спецыяльнасць лор-урача, працуе хірургам у бальніцы № 4 г. Мінска, асістэнтам кафедры лор-хвароб Мінскага медуніверсітэта. Малодшы сын – Канстанцін, 1973 года нар., закончыў біялагічны факультэт БДУ у 1995 г., спецыялізаваўся ў галіне фізіялогіі чалавека і жывёл, вывычаў практычную псіхалогію ў БДПУ ў 2005 г., «тэорыю і практыку гештальт-тэрапіі» Маскоўскага Гештальт-інстытута ў 2008 г., працуе інжынерам-праграмістам дызайн-цэнтра ААТ «Беларускія шпалеры», а таксама псіхолагам у крызісным цэнтры. Тамара Віктараўна Елісеева на працягу многіх гадоў працуе ў БДУ на кафедры англійскай мовы старшым выкладчыкам. Ужо выраслі ўнукі Міхаіла Герасімавіча. Саша ў 2009 годзе завяршыла навучанне на хімічным факультэце БДУ, Міша – у сярэдняй школе.

Міхаіл Герасімавіч заўчасна пайшоў з жыцця 5 жніўня 1997 г. пасля цяжкай хваробы. Многія свае творчыя планы ён не паспеў здзейсніць. У памяці некалькіх пакаленняў выпускнікоў гістарычнага факультэта БДУ, калег ён застаўся не толькі як выдатны прафесіянал, але і як сардэчны чалавек, які заўсёды мог прыйсці на дапамогу, даць параду, выслухаць і зразумець кожнага.

**Заключэнне.** Такім чынам, дасягненні М.Г. Елісеева як даследчыка германскай гісторыі навейшага часу прасочваюцца па наступных пазіцыях. Па-першае, ён упершыню ў беларускай гістарыяграфіі звярнуўся да праблем знешняй палітыкі ФРГ і ГДР, аналізу іх узаемаадносін; па-другое, першым усебакова даследаваў пытанні партыйна-палітычнай сістэмы ФРГ; па-трэцяе, падрыхтаваў і чытаў для студэнтаў змястоўныя спецкурсы па гісторыі ФРГ. М.Г. Елісееў, які многія гады працаваў на гістарычным факультэце БДУ, унёс значны ўклад у падрыхтоўку гісторыкаў Беларусі. Вучоны-міжнароднік, ён быў нястомным прапагандыстам палітычных ведаў для насельніцтва рэспублікі. У яго вобразе ў поўнай меры адлюстраваўся характар беларускага народа –

усё аддаць сваёй краіне: талент, гады, працу.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Архіў БДУ***. – Фонд 205. – Воп. 10. – Спр. 691. – Арк. 129–130.
2. ***Елісееў Міхаіл Герасімавіч*** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2003. – Т. 6. – Кн. 2: Усвея–Яшын; Дадатак. – С. 381–382.
3. ***Корзенко, Г.В.*** Историки Беларуси в начале XXI столетия: библиогр. справ. / Г.В. Корзенко. – Минск: Белорус. наука, 2007. – 470 с.
4. ***Імкнуцца да ісціны, але не ўпадаць у крайнасці*** / В. Кушнер [і інш.] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 6. – С. 47–49.
5. ***Елисеев, М.Г.*** Куда идет ФРГ? / М.Г. Елисеев. – Коммунист Белоруссии. – 1968. – № 11.
6. ***Елисеев, М.Г.*** Бонн и ГДР / М.Г. Елисеев. – Минск: БГУ, 1975. – 254 с.
7. ***Елисеев, М.Г.*** Два германских государства и европейская безопасность: история и современность / М.Г. Елисеев, В.Е. Снапковский. – Минск: Наука и техника, 1989. – 152 с.
8. ***Елисеев, М.Г.*** Между конфронтацией и разрядкой: СвДП в партийной системе ФРГ: проблемы «восточной» политики / М.Г. Елисеев. – Минск: БГУ, 1989. – 335 с.
9. ***Великая Победа и мировой революционный процесс*** / М.Г. Елисеев [и др.]; под ред. Л.М. Шнеерсона. – Минск: БГУ, 1985. – 172 с.
10. ***Рабочее и освободительное движение в странах зарубежной Европы и Америки в новое и новейшее время*** / М.Г. Елисеев [и др.]; под ред. Л.М. Шнеерсона. – Минск: БГУ, 1986. – 509 с.
11. ***Против буржуазной и реформистской идеологии*** / М.Г. Елисеев [и др.]; под ред. Л.М. Шнеерсона. – Минск: БГУ, 1972. – 212 с.
12. ***Белорусский государственный университет имени В.И. Ленина*** / М.Г. Елисеев [и др.]. – Минск: БГУ, 1982. – 95 с.
13. ***Елисеев, М.Г.*** К вопросу о развитии исторической германистики Нового времени в Беларуси / М.Г. Елисеев, О.Г. Радькова // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: новыя канцэпцыі і падыходы, Мінск, 3–5 лютага 1993 года. – Минск: Изд-во «Университетское», 1993. – Ч. II. Сусветная гісторыя. – С. 220–223.
14. ***Елисеев, М.Г.*** Новая и новейшая история в трудах белорусских исследователей (20–30-е годы XX в.) / М.Г. Елисеев, О.Г. Радькова // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: новыя канцэпцыі і падыходы, Мінск, 3–5 лютага 1993 года. – Мінск: Изд-во «Университетское», 1995. – Ч. II. Сусветная гісторыя. – С. 149–158.



## *SUMMARY*

*The article is devoted to the 70th anniversary of Associate professor M.G. Yelisseyev. The name of historian M. Yelisseyev is well known in scientific circles of Belarus and Germany.*



*Поступила в редакцию 15.01.2010*